Казакоў, Л. Ю. Інвентарныя вопісы маёнткаў як крыніца па вывучэнні эвалюцыі феадальнай гаспадаркі Беларусі XVI — першай паловы XVII ст. / Л. Ю. Казакоў// Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў ХХ—ХХІ ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 79-83

**Л. Ю. КАЗАКОЎ (Мінск)**

# ІНВЕНТАРНЫЯ ВОПІСЫ МАЁНТКАЎ ЯК КРЫНІЦА ПА ВЫВУЧЭННІ ЭВАЛЮЦЫІ ФЕАДАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ XVI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII ст.

Канец XVI — першая палова XVII ст. быў часам кардынальных пераўтварэнняў у эканамічным жыцці беларускіх зямель. На змену старым формам землеўладання і землекарыстання прыходзіць новая — фальваркава-паншчынная сістэма, пабудаваная на працы цяглавых сялян. Зразумела, што станаўленне новай сістэмы нараджала і новыя праблемы. Так, паўстала пытанне адаптацыі як землеўладальнікаў, так і землекарыстальнікаў да новых умоў гаспада



рання. Назіраць за працэсамі ўсталявання фальваркава-паншчыннай сістэмы можна пры дапамозе шэрага крыніц: уставаў, інвентароў, дакументаў уліку грашовых даходаў і расходаў, падатковай дакументацыі, а таксама статутаў Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. Сярод іх вялікае значэнне для даследчыка набываюць інвентары, бо яны з’яўляюцца самай масавай групай крыніц па вывучэнні эвалюцыі феадальнай гаспадаркі Беларусі XVI — першай паловы XVII ст.

Да інвентарных вопісаў маёнткаў (ад лац. ainventarium — вопіс) адносяцца апісанні феадальных уладанняў. У XVI ст. у дачыненні да іх ужываліся таксама азначэнні «пописы і рэестры». Звычайна яны складаліся на старабеларускай альбо польскай мове. Публікацыя інвентарных вопісаў пачалася яшчэ напрыканцы XIX ст. з выданнем Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі[1]. У 70—80-х гг. XX ст. была распачата публікацыя інвентароў у рамках серыі «Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII веков»[2]. Выданні гэтай серыі з’яўляюцца надзвычай каштоўнымі, таму што яны ўтрымліваюць у сабе інвентары аднаго і таго ж маёнтка за розныя гады, што дазваляе пры дапамозе кампаратыўных метадаў даследавання прасачыць эвалюцыю маёнтка за вялікі прамежак часу. Да нашага часу дайшла вялізная колькасць недаследаваных інвентароў. Частка з іх знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Надзвычай цікавымі з’яўляюцца інвентары, якія знаходзяцца ў 25-м аддзеле АГАД у Варшаве. Вялікая колькасць інвентароў знаходзіцца ў Цэнтральным гістарычным архіве Літвы.

Варта адзначыць, што большая частка інвентароў, дайшоўшых да нас, адносіцца да першай паловы XVII ст., бо ў другой палове XVI ст. яны з’яўляліся эпізадычна, а ў першай палове XVI ст. налічваецца толькі два экземпляры інвентарных вопісаў маёнткаў[3]. Гэта сведчыць пра тое, што інвентары з’яўляліся неад’емнай часткай фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання і па меры яе пашырэння павялічвалася і выкарыстанне інвентароў, як больш зручнай формы арганізацыі ўліку маёмасці. Інвентары можна падзяліць на тры групы: інвентары дзяржаўных, царкоўных і прыватных уладанняў. Інвентарныя вопісы складаліся ў асноўным паводле вызначанай структуры. Так, напачатку звычайна быў тытульны ліст, у якім указвалася назва маёнтка, яго ўладальнік, мэта і дата стварэння, імя пісара. Затым ішло апісанне цэнтральнай сядзібы маёнтка, пры гэтым пералічваліся і апісваліся ўсе надворныя пабудовы. Наступнай часткай інвентару была фіксацыя памеру пасеваў па культурах, колькасці ворыўнай і агароднай зямлі, крыніц дадатковых прыбыткаў (корчмаў, млыноў, кузняў і г. д.). Пасля гэтага звычайна ішло апісанне і пералік сельскіх валасцей, мястэчак, фальваркаў, якія адносіліся да дадзенага ўладання. Завяршаў жа стандартны вопіс маёнтка пералік землекарыстальнікаў і коль-



касць зямлі, якая знаходзілася ў іх карыстанні. Зразумела, што падрабязнасць інфармацыі залежала ад памеру ўладання. Так, пераважную большасць інвентароў складаюць вопісы фальваркаў і маёнткаў, але

сустракаюцца і інвентары іншых эканамічных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, напрыклад такіх, як княства, ваяводства, воласці, гарады і г. д.

Такім чынам, першай групай інвентароў з’яўляюцца інвентары дзяржаўных уладанняў. Для іх характэрна перш за ўсё тое, што паводле сеймавай пастановы 1562 г. яны павінны былі праводзіцца з перыядычнасцю раз на пяць год. Акрамя гэтага, Сеймавай канстытуцыяй 1601 г. рэгламентаваўся парадак правядзення інвентарнага апісання дзяржаўнага ўладання[4]. Праўда, звычайна інвентары складаліся значна радзей. Але, нягледзячы на тое, сам факт наяўнасці інвентарных вопісаў аднаго і таго ж маёнтка за розныя гады дазваляе

пры дапамозе кампаратыўных метадаў даследавання прасачыць дынаміку развіцця гаспадаркі, вызначыць ступень яе даходнасці і рэнтабельнасці. Вялікую цікавасць сярод інвентароў дзяржаўных уладанняў уяўляюць люстрацыі, якія складаліся паводле матэрыялаў рэвізіі маёмасці. Пры гэтым, акрамя пераліку маёмасці, у люстрацыях часта сустракаюцца рэкамендацыі мясцовай адміністрацыі адносна паляпшэння землекарыстання, што само па сабе з’яўляецца надзвычай каштоўнай інфармацыяй.

Інвентары царкоўных уладанняў складаюць другую групу гэтых дакументаў. Для іх характэрна тое, што вялікая ўвага пры стварэнні інвентароў надзялялася абгрунтаванню правоў царквы на землеўладанне. Гэта адбывалася таму, што вельмі часта шляхта выказвала прэтэнзіі да царкоўных землеўласнікаў з нагоды быццам бы неправамернага карыстання пэўным вызначаным маёнткам. Гэтыя звесткі з’яўляюцца вельмі каштоўнымі для вывучэння шляхоў замацавання зямельнай уласнасці за пэўным феадалам, у дадзеным выпадку ім выступала царква.

Трэцяй групай інвентароў з’яўляюцца інвентары прыватных уладанняў, якія падзяляюцца на дзве групы: інвентары буйных магнацкіх уладанняў і інвентары маёнткаў дробнай і сярэдняй шляхты. Інвентарныя вопісы буйных магнацкіх уладанняў вызначаюцца павышанай дакладнасцю і скрупулёзнасцю апісання маёнтка. Характэрным прыкладам падобных вопісаў з’яўляецца інвентар фальварка Скепева і Скепеўскай воласці маёнтка Цімкавічы, які належаў у першай палове XVII ст. прадстаўнікам роду Сапегаў[5]. На пачатку інвентару знаходзіцца тытульны ліст, які ўтрымлівае ў сабе інфармацыю пра тое, што дадзены дакумент створаны ў ліпені 1638 г. пры перадачы маёнтка з арэнды панам Юрыям Трыбушком. Затым ідзе падрабязнае апісанне надворных пабудоў асноўнай сядзібы, а таксама драўляных прылад працы, гумна, двара для жывёлы, сажалкі, саду і пералік жывёлы. Пасля гэтага ідзе пералік сялян



воласці, якія належалі да фальварка, зямлі, якая знаходзілася ў іх карыстанні, а таксама жывёлы, якая ім належала. Заканчваўся інвентар пералікам павіннасцей, якія выконвалі сяляне. Падобная інфармацыя была дадзена і на вёскі, якія не належалі да асноўнага комплексу фальварка (Канатопцы, Загроднікі, Доўгае і Калодзезна), а таксама колькасць павіннасцей агароднікаў. Трэба адзначыць, што дадзены інвентар ствараўся з прычыны вяртання маёнтка першапачатковаму ўладальніку з арэнды панам Юрыям Трыбушком. Таму ў ім утрымліваюцца звесткі пра сам працэс перадачы фальварка і параўнання існуючай маёмасці з маёмасцю, існаваўшай на момант стварэння папярэдняга інвентару. Пры гэтым з’яўляліся спрэчныя пытанні, выкліканыя неадпаведнасцю колькасці маёмасці. Так, можна працытаваць адно з іх: «Согласно первому инвентарю недостает посева зерна: ржи 15 бочек, овса 10 бочек, гречихи 8 бочек. Поэтому мы потребовали, чтобы пан Трибушок заплатил нам за это зерно. А пан Трибушок утверждал, что в то время, когда ему передали фольварок, так много зерна не было засеяно и доказал путем показаний всех подданных его милости, что гораздо больший участок, засеянный рожью, он передал теперь, а также удобрений гораздо больше он употребил и зерна по сравнению с первым инвентарем засеял больше на 50 бочек, за что настойчиво требовал оплаты»[6]. У гэтым урыўку мы сутыкаемся з тэндэнцыяй, характэрнай для інвентароў, якія ствараліся для продажу ці перадачы ў арэнду маёнткаў, — крыху перабольшваць памер маёмасці. Варта адзначыць, што менавіта для інвентароў прыватных уладанняў характэрна суіснаванне розных адзінак падаткаабкладання: валокаў, службаў і дымоў. У якасці прыкладу можна прывесці даныя, змешчаныя ў пераліку павіннасцей сялян маёнтка Бучы: «Работы на кожны тыдзень па два дні з валокі і з дыму адзін дзень. Вартаўніка аднаго павінны па чарзе даваць. У падводы ездзіць. А чыншу з валокі даваць павінны грашыма па дзве капы. Аўса бочку меры гандлёвай клецкай, гуся аднаго, чатыры курыцы, дваццаць яек, лёну дзесяць горсцяў і па сто грыбоў»[7]. Як бачым, падымнае падаткаабкладанне выкарыстоўвалася для вызначэння памераў паншчыннай працы разам з валочным. Пры гэтым выключна валочнае падаткаабкладанне выкарыстоўвалася пры вызначэнні чыншу, а таксама іншых натуральных падаткаў.

Варта адзначыць наступныя мэты стварэння фальваркаў: падчас продажу ці перадачы ў арэнду маёнтка, планавае стварэнне інвентарных вопісаў (больш характэрна для дзяржаўных уладанняў), пры правядзенні валочнай памеры, пры памеры зямельных уладанняў (так званыя геаметрычныя інвентары), для фіксацыі размеркавання і карыстання зямлёй у пэўным маёнтку. Таму пры аналізе інфармацыі, змешчанай у інвентары, неабходна ўлічваць прычыну яго стварэння, таму што, напрыклад, пры продажы маёнтка зразумела імкненне



папярэдняга ўладальніка пры вопісе маёмасці крыху перабольшыць яе памер, каб падняць кошт маёнтка.

Такім чынам, інвентары з’яўляюцца надзвычай каштоўнай крыніцай вывучэння эвалюцыі феадальнай гаспадаркі Беларусі XVI — першай паловы XVII ст. Дзякуючы падрабязнасці інфармацыі наконт маёмасці маёнтка, характэрнай для інвентарных вопісаў, становіцца магчымым скласці дакладнае апісанне стану, формаў, метадаў землекарыстання таго часу, прасачыць дынаміку развіцця пэўнага маёнтка і, увогуле, сельскай гаспадаркі, вызначыць ступень яе рэнтабельнасці.

---

[1] Гл. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. Т. 14, 25, 35, 38. Вильна, 1887—1914.

[2] Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII веков. Владение Сморгонь. Минск, 1977; Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII веков. Владение Тимковичи, Минск, 1982.

[3] Копысский З. Ю. Источниковедение аграрной истории Белоруссии. Минск, 1978. С. 5.

[4] Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI—XVIII стст. Мінск, 1992. С. 14.

[5] Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII вв. Владение Тимковичи. С. 6.

[6] Тамсама. С. 23.

[7] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 778. Л. 77 адв.